**Нагода.** У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі нядаўна прайшла першая публічная лекцыя «Крыніцы гістарычнай памяці», прысвечаная Году гістарычнай памяці. Абмеркаваны актуальныя пытанні развіцця беларускай літаратуры і літаратуразнаўства, крыніцазнаўства і медыялінгвістыкі. Удзельнікі пазнаёміліся з навуковымі выданнямі аб старабеларускай літаратуры XI—XVII стагоддзяў, каштоўнымі помнікамі і дасягненнямі нацыянальнага пісьменства. Дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН, член прэзідыума Саюза пісьменнікаў Беларусі, прафесар Іван Саверчанка выступіў з тэмай «Беларуская літаратура эпохі готыкі, рэнесансу і барока». Лекцыі праводзяцца для публікі бясплатна.